# Польскі вопыт у захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны

© Таццяна Мармыш

Пры выкарыстанні прадстаўленых матэрыялаў абавязковая спасылка на дадзеную прэзентацыю

**Нарматыўна-прававая база па ахове нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы**

1) Канстытуцыя 1997 г., у якой захаванне нацыянальнай спадчыны прадстаўляецца сярод найбольш важных задач Рэспублікі Польшча

(Art. 5. **Rzeczpospolita Polska** strzeże niepodległości i nienaruszalności swojego terytorium, zapewnia wolności i prawa człowieka i obywatela oraz bezpieczeństwo obywateli, **strzeże dziedzictwa narodowego** oraz zapewnia ochronę środowiska, kierując się zasadą zrównoważonego rozwoju

## Нарматыўна-прававая база па ахове нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы

2) Закон аб ахове помнікаў і доглядзе за помнікамі ад 23 ліпеня 2003 г. (Ustawa z dn. 23 lipca 2003 r. o ochronie zabytków i opiece nad zabytkami) рэгулюе пытанні, звязаныя з аховай і кіраваннем культурнай спадчынай - як матэрыяльнай, так і нематэрыяльнай.

## Нарматыўна-прававая база па ахове нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы. Генезіс

Дэкрэт регенскага Савета аб доглядзе за помнікамі культуры і мастацтва ад 31 кастрычніка 1918 г. (Dekret Rady Regencyjnej podpisany 31 października 1918 r. o opiece nad zabytkami sztuk i kultury)

Распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі аб доглядзе за помнікамі ад 6 сакавіка 1928 г., якое легла ў аснову для стварэння рэестру помнікаў

## Нарматыўна-прававая база па ахове нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы

Маюць уплыў на ахову НКС:

Закон аб музеях
Закон аб бібліятэках
Закон аб польскай мове
Закон аб ахове навакольнага асяроддзя
Закон аб ахове прыроды
Закон аб нерухомасці
Закон аб тэрытарыяльным планаванні і развіцці
Закон аб будаўніцтве
Закон аб абароне персанальных дадзеных
Закон аб абароне сакрэтнай інфармацыі

## Нарматыўна-прававая база па ахове нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы

Закон аб музеях ад 21 лістапада 1996 г.

Ахова НКС - місія музея, якая ў арт. 1 гэтага Закона, вызначаецца як:

“...*збор і пастаянная абаронай прыроднай і культурнай спадчыны чалавецтва матэрыяльнай і нематэрыяльнай, інфармаванне пра каштоўнасць і змест назбіраных калекцый, прасоўванне асноўных каштоўнасцей гісторыі, навукі і культуры Польшчы і свету, фарміраванне спазнаўчай і эстэтычнай адчувальнасці, а таксама стварэнне магчымасці для выкарыстання сабраных калекцый*”.

## Сістэма кіравання аховай нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы

Асноўная роля - мясцовыя органы ўлады.

Кола задач дзяржаўнага кіравання і мясцовага самакіравання вызначана польскай Канстытуцыяй і Законам аб рэгіянальным самакіраванні (1998), дзе сцвярджаецца, што ўрад ваяводства праводзіць палітыку

«*падтрымкі развіцця культуры і догляду за ажыццяўленнем захавання культурнай спадчыны і яе рацыянальным выкарыстаннем*«.

## Сістэма кіравання аховай нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы

Польшча далучылася да Канвенцыі аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны 2003 г. у 2011 г.,

Канвенцыя 2003 г. - дапаўненне і ўдасканаленне існуючых нацыянальных прававых асноў захавання і кіравання НКС.

Арт. 2 Канвенцыі 2003 г.:

ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны ажыццяўляецца шляхам ідэнтыфікацыі, дакументацыі, даследавання, захавання, прамавання, умацавання, перадачы (фармальная і нефармальная адукацыя), і рэвіталізацыя.

## Сістэма кіравання аховай нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы

**Нацыянальны інстытут спадчыны** (Narodowy Instytut Dziedzictwa/NID) дзейнічае з 2011 г. і з'яўляецца ўстановай культуры-экспертным цэнтрам для Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны.

Сярод задач Інстытута – збіраць і распаўсюджваць веды аб спадчыне, пашыраць дасведчанасць грамадскасці аб каштоўнасці і захаванні культурнай спадчыны.

Інстытут супрацоўнічае з ЮНЕСКА, English Heritage ці European Heritage Heads Forum.

NID з'яўляецца каардынатарам Еўрапейскіх дзён спадчыны ў Польшчы, святкавання Міжнароднага дня аховы помнікаў і памятных мясцін.

## Сістэма кіравання аховай нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы

**Аддзел аховы культурных традыцый НІД** займаецца выключна пытаннямі Канвенцыі ЮНЕСКА 2003 г.:

- распрацоўка сістэмных рашэнняў;
- праводзіць навучальную, інфармацыйную і кансультатыўную дзейнасць;
- ажыццяўляе выдавецкую дзейнасць;
- арганізуе супрцоўніцтва на нацыянальным і міжнародным узроўнях;
- дакументаванне;
- ажыццяўляе арганізацыйную падтрымку Нацыянальнага спісу нематэрыяльнай культурнай спадчыны

## Сістэма кіравання аховай нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы

Узроўні ўзаемадзеяння - цэнтральны, рэгіянальны і мясцовы.

**Цэнтральны ўзровень:**

- дзяржаўныя органы (Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны, Нацыянальны інстытут спадчыны, Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі і Міністэрства адукацыі);

**Рэгіянальны ўзровень** - узровень ваяводстваў:

- упраўленні маршалкаў і падведамных установ культуры, а таксама навуковая супольнасць і няўрадавыя арганізацый.

Кансультант па НКС пры упраўленні маршалка ў кожным з 16 ваяводстваў каардынуе работу па ахове НКС у рэгіёне.

Рэгіянальныя каардынатары аказваюць кансультацыі і дапамогу па пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай заявак для ўключэння ў Нацыянальны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

## Сістэма кіравання аховай нематэрыяльнай спадчыны ў Польшчы

Узроўні ўзаемадзеяння - цэнтральны, рэгіянальны і мясцовы.

**Мясцовы ўзровень:**

- мясцовыя супольнаці і грамадскія арганізацыі, якія прадстаўляюць супольнасць, мясцовыя лідары, прадстаўнікі навуковай сферы, супольнасцей, якія не з'яўляюцца членамі мясцовых груп.

## Нацыянальны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны (Krajowa lista niematerialnego dziedzictwa kulturowego)

Спіс (2013) - нацыянальны пералік праяў жывой нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая існуе на тэрыторыі РП.

Спіс змяшчае апісанне НКС, інфармацыю пра месца бытавання, важнасць яе практыкі для супольнасці, а таксама фотаматэрыялы.

Спіс мае чыста інфарматыўны характар і ў той жа час з'яўляецца падставай падрыхтоўкі заяўкі для ўключэння НКС ў міжнародныя спісы ЮНЕСКА.

# Нацыянальны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны

http://niematerialne.nid.pl/Dziedzictwo_niematerialne/Krajowa_inwentaryzacja/Krajowa_lista_NDK/

**KRAJOWA LISTA NIEMATERIALNEGO DZIEDZICTWA KULTUROWEGO**

Rusznikarstwo artystyczne i historyczne

Szopkarstwo krakowskie

Zabawkarstwo żywiecko-suskie

Bartnictwo

Bartnictwo

Rok wpisu na Krajową listę: 2016



Bartnictwo jest zestawem praktyk, wiedzy i tradycji dotyczących pszczoły miodnej, jej zwyczajów, upodobań i zachowań w interakcji z człowiekiem oraz otaczającą przyrodą. Polega na przekonaniu, że pszczoła najlepiej żyje i rozwija się wysoko nad ziemią, a człowiek nie powinien ingerować w rozwój rodziny pszczelej. W tym celu przygotowuje się w pniach drzew żyjących lub kłodach wykonanych ze ściętych pni dziuple, zwane „barciami", przeznaczone na gniazda dla pszczoły miodnej. Wykonanie

**Нацыянальны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны**

Заяўкі на ўключэнне ў Спіс могуць рыхтаваць мясцовыя супольнасці, няўрадавыя арганізацыі або асобы, звязаныя з НКС.

Працэдура ўключэння ў спіс:

- заяўка дасылаецца ў НІД, які правярае яе фармальны бок і дасылае на разгляд Рады па справах НКС пры Міністэрстве культуры;
- рада верыфікуе заяўку з пункту гледжання крытэрыяў уключэння у спіс і перадае сваё заключэнне Міністру культуры;
- Міністр дае згоду на уключэнне ў Спіс.

## Нацыянальны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны

### Шэсце Лайконіка ці коніка Звежынецкего
### (Pochód Lajkonika, Pochód Konika Zwierzynieckiego)








## Нацыянальны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны

### Мова эсперанта як носьбіт эсперанцкай культуры (культуры Język esperanto jako nośnik kultury esperanckiej)



## Нацыянальны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны

### Працэсія Божага цела ў Ловічы
### (Procesja Bożego Ciała w Łowiczu)







## Нацыянальны рэестр лепшых практык па ахове НКС

Нацыянальны рэестр лепшых практык па ахове НКС (2018)

- гэта платформа для абмену вопыту.

• знаходзіцца ў падпарадкаванні Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны
• мае інфармацыйны характар
• з’яўляецца формай распаўсюджвання ведаў аб праграмах, праектах і мерапрыемствах, якія праводзяцца на тэрыторыі Польшчы для захавання НКС
• «Прыступка« да намінавання ў Рэестр лепшых практык ЮНЕСКА


Lubię to! 0 Tweet

Krajowy rejestr dobrych praktyk

Zapraszamy do składania wniosków.

**W 2018 roku ruszył Krajowy rejestr dobrych praktyk na rzecz ochrony niematerialnego dziedzictwa kulturowego.**

W myśl konwencji UNESCO z 2003 roku są to krajowe, regionalne lub ponadregionalne praktyki, mające na celu ochronę dziedzictwa, najlepiej odzwierciedlające zasady i cele Konwencji.
Krajowy rejestr ma charakter informacyjny, stanowiąc formę upowszechniania wiedzy o programach, projektach i działaniach prowadzonych na terenie Polski, mających na celu ochronę niematerialnego dziedzictwa kulturowego.

Formularz wniosku i regulamin dostępne są w zakładce: Pliki do pobrania.

**Нацыянальны рэестр лепшых практык па ахове НКС**

Нацыянальны рэестр лепшых практык па ахове НКС (2018)

Крытэрыі:

- арт. 2 ст. Канвенцыі 2003 г.
- супрацоўніцтва і каардынацыя дзеянняў па ахове НКС на мясцовым, рэгіянальным, нацыянальным або міжнародным узроўні.
- эфектыўнасць у садзеянні жыццяздольнасці НКС.
- удзелам супольнасцей, груп і асоб, звязаных з элементам і іх добраахвотная, папярэдняя і свядомая згода.
- добры прыклада для рэалізацыі на мясцовым, субрэгіянальным, рэгіянальным, нацыянальным або міжнародным узроўні.

## Нацыянальны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны

Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва

**Кракаўскія шопкі (Szopkarstwo krakowskie)**







## Праграмы Міністэрства культуры

Раз на год аб'яўляецца набор на фінінсаванне праектаў Міністрам культуры ў розных катэгорыях (Muzyka, Teatr i Taniec, Kolekcje muzealne, Ochrona zabytków, Wspieranie działań muzealnych, Ochrona dziedzictwa kulturowego za granicą, Ochrona zabytków archeologicznych, Groby i cmentarze wojenne w kraju, Infrastruktura kultury, Kultura Dostępna, Promocja kultury polskiej za granicą).

**Kultura ludowa i tradycyjna** Народная і традыцыйная культура
Мэта праграмы з'яўляецца падтрымка з'яў, звязаных з традыцыйнай культурай, што існуе на мясцовым, рэгіянальным і нацыянальным узроўнях на гарадскіх і сельскіх тэрыторыях.

У 2019 г. праграма распаўсюджваецца на задачы, звязаныя з пераемнасцю традыцый, пры гэтым яе дыяпазон адпавядае мэтам Канвенцыі ЮНЕСКА 2003 г.

**Праграма НІД "Разам для спадчыны"**
**(„Wspólnie dla dziedzictwa")**

Праграма дзейнічае з 2016 г. і адрасавана няўрадавым арганізацыям для работы з мясцовымі супольнасцямі.

Мэта - стварэнне ўмоў для ўстойлівага захавання культурнай спадчыны і выкарыстанне яе каштоўнасці для сацыяльнага развіцця цяперашніхі будучых пакаленняў.

Задачы праектаў:

- праца па парадкаванню, ачыстцы помнікаў, уключаных у рэестр;
- ідэнтыфікацыя, інвентарызацыя, дакументаванне спадчыны (матэрыяльнай і нематэрыяльнай);
- мерапрыемствы, накіраваныя на ўмацаванне сацыяльна-культурнай практыкі традыцый, у тым ліку традыцый рамесніцтва і традыцый, звязаных з вуснай перадачай, распаўсюджванне традыцыйных будаўнічых тэхнік;
- адукацыйныя мерапрыемствы і мерапрыемствы па папулярызацыі культурнай спадчыны (матэрыяльнай і нематэрыяльнай) і ведаў аб ёй.

## Праграма НІД “Разам для спадчыны” („Wspólnie dla dziedzictwa”)

Конкурс заявак - у сярэднім каля 150 заявак у 2 катэгорыях – “Валанцёрства для спадчыны” („Wolontari dla dziedzictwa”) і “Распаўсюджванне спадчыны” („Upowszechnianie dziedzictwa”).
Фінансуецца каля 40 заявак.

Умовы:

- праект патрабуе ўдзелу не менш за 5 добраахвотнікаў;
- недапушчальна, каб на аснове ўдзелу ў праекце студэнтам залічалася студэнцкая практыка;
- з валанцёраў не дазваляецца спаганяць любыя выдаткі, звязаныя з праектам.

Асноўнае патрабаванне - арганізаваць валанцёрам мінімум 3-дзённы лагер, што павінна мабілізаваць арганізацыі для пошуку валанцёраў.

**Грамадская кампанія «Ландшафт майго горада» (Kampania społeczna "Krajobraz mojego miasta“)**



Мэта - увага мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў і ўстаноў і грамадскасці да праблемы хаосу рэкламы і належнага гарадскога планавання.

Самым важным элементам кампаніі з'яўляецца навучальны фільм пад назвай: «Ландшафт майго горада».

Шэраг адукацыйных і папулярызацых момантаў:
- паказ фільма ў рэгіёнах і правядзеннем нарад для мясцовых органаў;
- шматлікія публікацыі навучальнага плану: "Кніга стандартаў Пётркоўскай», «Спадчына побач са мной - кіраўніцтва па менеджменце спадчыны у муніцыпалітэтах» і «Асновы дызайну і медыя размяшчэння візуальнай інфармацыі і рэкламы на будынках і гістарычных раёнах;
- бясплатнае навучанне па ўпраўленні спадчыны, выкладаюць спецыялісты з НІД.

**Гарадскія і вясковыя гульні (матэрыяльная і нематэрыяльная спадчына, для розных катэгорый)**

Фінансаванне ад Міністэрства культуры=доступ бясплатны

“Пазбірай помнікі”« (Гдыня, Гданьск, Сопат, Надбалтыйскі цэнтр культуры ў Гданьску);

Гарадская гульня для ўсёй сям'і “Збяры звярынец” (выявы жывёл на гарадскіх камяніцах, Гданьск);

Гарадская гульня для школ “У пошуках казак і міфаў” (галаваломкі, звязаныя з міфалагічнымі матывамі, размешчанымі на помніках культуры і гісторыі ў Гданьску).










## DailyArt

DailyArt - праект польская кампанія Moiseum (сучасныя тэхналогіі для інстытуцый культуры, музеяў, дадаткі для мабільных тэлефонаў).
Гэта дадатак для маб. тэлефонаў, прызначаны для тых, хто цікавіцца мастацтвам і культурай. Бясплатнае прыкладанне даступна на англійскай мове і польскай. Карыстальнікі атрымліваць інфармацыю аб адным творах мастацтва свету і польскіх музеяў разам з кароткай гісторыяй прадмета і апісання.

У 2014 у дадатку былі прадстаўлены выявы з базы ваенных страт Міністэрства культуры.



## Люблін 2.0

Мабільны давежнік, які дае магчымасць спазнаць горад з выкарыстаннем тэхналогіі дапоўненай рэальнасці.

14 маршрутаў па Любліне з выкарыстаннем дапоўненай рэальнасці, што дазваляе, акрамя азнаямлення з апісаннямі розных месцаў, параўнаць сучасную гарадскую прастору з яе станам у мінулым, убачыць архіўныя фатаграфіі, убачыць 3D мадэлі неіснуючых помнікаў і, нават, слухаць вершы пра горад.

**Кароткія высновы:**

1) заканадаўчая база
2) імплементацыя Канвенцыі 2003 г. у нацыянальную практыку
3) асобны цэнтр па НКС - Нацыянальны інстытут спадчыны
4) ініцыятыва «знізу уверх«, кансультанты ў рэгіёнах
5) праектная работа
6) развіццё валанцёрскай дзейнасці